**ВОДЗЫЎ**

на аўтарэферат дысертацыі Захаравай Марыны Сяргееўны
"Поліфункцыянальнасць эпіграфа ў беларускіх і англамоўных кароткіх апавяданнях", прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
(спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура, 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія)

Эпіграф уяўляе сабой надзвычай цікавую частку тэксту. Нягледзячы на невялікі аб'ём адносна самага твора і прыналежнасць іншаму аўтару (часцей за ўсё ў якасці эпіграфа выкарыстоўваецца цытата з чужога твора), ён можа мець некалькі функцый, арганічна дапаўняць і тлумачыць асноўны мастацкі тэкст. У сувязі з гэтым мае сэнс не толькі цэласнае вывучэнне літаратурнага твора, але і навуковае даследаванне асобных яго частак, пэўных фрагментаў, якія дазваляюць зірнуць на ідэйны змест, праблематыку і мастацкія вобразы па-новаму, устанавіць паралелі паміж рознымі тэкстамі, а таксама прасачыць іх узаемадзеянне. Актуальнасць навуковай работы М.С. Захаравай абумоўлена неабходнасцю правядзення комплекснага вывучэння функцый эпіграфа ў межах розных літаратур і жанраў, даследавання асаблівасцей эпіграфа і выяўлення яго агульных уласцівасцей ў беларускай і англамоўнай літаратурах. У дысертацыйным даследаванні ўпершыню распрацавана трохступеньчатая схема аналізу эпіграфа ў беларускіх і англамоўных кароткіх апавяданнях, якая абапіраецца на яго поліфункцыянальныя асаблівасці, прадэманстравана магчымасць адрасацыі эпіграфа да розных суб'ектаў, выяўлены інфарматыўная, інтэртэкстуальная, фатычная, канатыўная, эматыўная, паэтычная і шматлікія іншыя функцыі эпіграфа ў канкрэтных тэкстах.

Знаёмства з аўтарэфератам дае магчымасць зрабіць выснову, што дысертацыя М.С. Захаравай мае прадуманую, лагічную структуру, якая дазваляе паслядоўна вырашыць задачы даследавання і раскрыць палажэнні дысертацыі. У першым раздзеле аналізуюцца тэарэтычныя аспекты вывучэння эпіграфа мастацкага тэксту, прадстаўлены навуковыя дасягненні ў вобласці даследавання эпіграфа, звяртаецца ўвага на сучасны стан праблемы. Дысертантка падкрэслівае, што ў сваёй навуковай рабоце трактуе эпіграф як паратэкст, а пры даследаванні функцый эпіграфа выкарыстоўвае трохступеньчатую сістэму аналізу.

Выбар кароткіх апавяданняў беларускіх і англамоўных пісьменнікаў XIX – пач. XXI ст. у якасці матэрыялу даследавання падаецца лагічным і абгрунтаваным, паколькі, з аднаго боку, ахапіць усе жанры ў рамках кандыдацкай дысертацыі немагчыма, а з іншага – вялікая колькасць тэкстаў,

якія прадстаўляюць адзін жанр, можа прадэманстраваць найбольш поўна магчымыя функцыі эпіграфа.

Выразна прасочваецца логіка падзелу матэрыялу ў другім, трэцім і чацвёртым раздзелах дысертацыі. Другі раздзел прысвечаны функцыям эпіграфа ў адносінах да чытача і да аўтара твора. У трэцім і чацвёртым раздзеле М.С. Захарава аналізуе ўнутрытэкставыя і пазатэкставыя функцыі эпіграфа ў беларускіх і англамоўных кароткіх апавяданнях. Рознабаковы і дэталёвы падыход да даследавання мастацкіх твораў даў магчымасць саіскальніцы навуковай ступені сфармуляваць доказныя палажэнні, якія адлюстроўваюць спецыфіку, поліфункцыянальнасць эпіграфаў і спосабы іх рэпрэзентацыі.

Даследаванне выканана на высокім навуковым ўзроўні. Уважлівае стаўленне М.С. Захаравай да вывучэння тэкстаў, уменне заўважаць дробныя дэталі падкрэслівае сур'ёзнасць і адказнасць саіскальніцы ў адносінах да навуковай работы, у якой выкарыстоўваюцца сучасныя метады літаратуразнаўчага даследавання. Добры ўзровень апублікаванасці вынікаў дысертацыі выяўляе зацікаўленасць аўтара ў абранай тэме і імкненне прадставіць працу шырокаму колу чытачоў.

Аўтарэферат дысертацыі М.С. Захаравай "Поліфункцыянальнасць эпіграфа ў беларускіх і англамоўных кароткіх апавяданнях" сведчыць аб належнай навуковай падрыхтоўцы аўтара і высокім кваліфікацыйным узроўні дысертацыйнай работы. М.С. Захарава заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.01.01 – беларуская літаратура, 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія.

Дацэнт кафедры
беларускай і замежнай філалогіі
Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў",
кандыдат філалагічных навук [signature] С.М. Тычына

Водгук паступіў у савет па абароне дысертацый Д 01.42.04
09.03.2023г.
вуч. сакратар савета
[signature] (Богдан А.Ў.)

Отдел правовой и кадровой работы
Подлинность подписи удостоверяю
Вед. спец. [signature] Ю.А. Подолько
06.03.2023

С отзывом ознакомлена
16.03.2023 [signature] /М.С. Захарова/